**Пятушка, А.** Вайна вачыма салдата / А. Пятушка // Браслаўская звязда. – 2016. – 6 лют. – С. 1.

# ВАЙНА ВАЧЫМА САЛДАТА

*Даўно сышла ў мінулае Афганская вайна, якая працягвалася 9 гадоў і 51 дзень. Непасрэдны ўдзел у тых ваенных падзеях прымалі і 110 жыхароў Браслаўшчыны, 30 з іх атрымалі дзяржаўныя ўзнагароды: 6 чалавек – ордэн «Чырвонай Зоркі» (У. Лясовіч – двойчы), 22 – медаль «За адвагу» і 6 – «За баявые заслугі». Адзін наш зямляк, Валерый Аляксандравіч, загінуў. Дзевяць удзельнікаў той вайны не дажылі да 50-ці гадоў. Як напрыканцы 20 стагоддзя, так і сёння, адносіны грамадства да тых падзей на чужой тэрыторыі неадназначныя. А як бачыў вайну 18-цігадовы юнак-салдат? Які след яна пакінула ў яго сэрцы? Ці змяніліся з цягам часу адносіны да яе? З гэтымі пытаннямі звярнуўся да былых «афганцаў».*



***З успамінаў Леаніда Мікшты – старшыні РГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане»:***

Перад службай у арміі два гады займаўся ў спартыўнай школе г. Магілёва. І калі ў сакавіку 1981 года атрымаў павестку, быў упэўнены, што мяне накіруюць у спартыўную часць. Але маім спадзяванням не суджана было спраўдзіцца.

Курс маладога байца праходзіў у г. Тэрмез Узбекскай ССР, дзе за месяц атрымаў ваенную спецыяльнасць вадзіцеля БТР і БРДМ. Адкуль майскай ноччу накіравалі ў Афганістан.

Першыя ўражанні: пранізлівая цішыня, а раніцай – выбухі і стрэлы. Вось тады мы, маладыя хлопцы, зразумелі, што трапілі на вайну. Перад намі стаяла баявая задача: суправаджаць вайсковыя калоны. Аднойчы ў раёне г. Баграма наш БТР наскочыў на міну. На шчасце, усе члены экіпажа засталіся ў жывых. За гэта, як камандзіра адзялення, мяне ўзнагародзілі медалём «За баявыя заслугі». Паўтара месяца лячыўся ў ваенным шпіталі ў Самаркандзе. Пасля выпіскі выдалі дакументы, і да месца службы трэба было дабірацца самому. Добра што незадоўга да гэтага ў шпіталь наведаліся бацькі і пакінулі крыху грошай, дзякуючы ім і даехаў.

Нягледзячы на тое, што зносіны з мясцовымі жыхарамі былі забаронены, салдаты пастаянна выменьвалі розныя рэчы. (Леанід беражна захоўвае афганскі гадзіннік – памяць пра баявую маладосць). Безумоўна, было цяжка і жудасна. Але лічу, калі Радзіма загадала – значыць так трэба!

Пасля звальнення ў запас выдалі грошы за 2 гады службы, таму да хаты з Мінска прыехаў на таксі, бо хацелася хутчэй дадому.

Упэўнены – хлопцам служыць у арміі трэба, бо менавіта там юнакі становяцца сапраўднымі мужчынамі.



*А. Мікшта ў час службы*

**Алена Пятушка**

***Фота з архіва Л. Мікшты***